12. *Kosman, M.* Historia Białosusi / M. Kosman. – Wrocław: Ossolineum, 1979. – 405 s.
13. Historia Litwy / J. Ochmański; wydanie trzecie poprawione i uzupelnione. – Wrocław: Ossolineum, 1990. – 396 s.
14. Historia Litwy od czasów najdawniejszych do 1795 roku / Z. Kiaupa, J. Kiaupienė, A. Kuncevičius. – Warszawa: PWM, 2008. – 386 s. (арыгінальная назва: Lietuvos istorija iki 1795 metų. Vilnius, 2000).
15. Historia Litwy. Dwugłos polsko-litewski / A. Rachiba, J. Kiaupienė, Z. Kiaupa. – Warszawa: DiG, 2009. – 388 s.
16. Kultura Wielkiego Księstwa Litewskiego: analiza i obrazy. Kraków: Universitas, 2006. – 934 s. (арыгінальная назва: Lietuvos Didžiosios Kunigaikštijos kultūra. Tyrinėjimas ir vaizdai. Vilnius, Aidai, 2001).
17. Lietuvos Istorija. T.IV.: Nauji horizontai: Dinastija. Visuomenė. Valstybė. Lietuvos Didžioji Kunigaikštystė 1386–1529 m. / J. Kiaupienė, R. Petrauskas. – Vilnius: Baltas lankos, 2009. – 552 p.

**(Дата падачы: 28.02.2018 г.)**

*Я. М. Ляпешкін*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск
*Y. N. Liapeshkin*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(46)«18»**

# ЭВАЛЮЦЫЯ СЛУЖБОВЫХ ФУНКЦЫЙ І ПАЎНАМОЦТВАЎ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНАТАРАЎ У ЧАС РЭФОРМАЎ 1860–1870-Х ГГ.

# EVOLUTION OF JOB FUNCTIONS AND POWERS OF THE BELARUSIAN GOVERNORS DURING THE 1860–1870-IES.

*У артыкуле прааналізаваны асноўныя заканадаўчыя акты, якія вызначалі функцыі і межы ўлады губернатараў. Адзначаюцца асаблівасці зменаў губернатарскіх паўнамоцтваў на тэрыторыі Беларусі ў 60–70-я гг. XIX ст. Зроблена выснова аб тым, што абмежаванасць рэформаў на беларускіх землях захавала больш шырокія функцыі мясцовых губернатараў у адрозненне ад унутраных расійскіх губерняў.*
*Ключавыя словы: губернатары; беларускія губерні; чыноўнікі; генерал-губернатары; рэформы 1860–1870-х гг.*

*The article analyzes the basic legislative acts defining the functions and limits of the power of governors. There have been particularly changes in the governor's office in the territory of Belarus in the 60–70-ies. XIX century. It is concluded that the limited reforms on the Belarusian land has kept the broader functions of local governors, in contrast to the internal Russian provinces.*
*Keywords: governors; Belarusian province; officials; governors-general; the reform of the 1860–1870-ies.*

У сучаснай гістарыяграфіі шмат увагі надаецца дзейнасці губернатараў у Расійскай імперыі [1–3]. Разам з тым асаблівасці паўнамоцтваў начальнікаў беларускіх губерняў закранаюцца не так часта. Тым не менш

у заканадаўчых, распарадчых і іншых дакументах XIX ст. адлюстравалася спецыфіка кіравання на ўскраінных тэрыторыях Расіі, у тым ліку на беларускіх землях.

Функцыі і паўнамоцтвы губернатараў вызначала «Агульнае губернскае ўстанаўленне» Звода законаў Расійскай імперыі 1857 г. [4], якое было складзена на аснове «Агульнага наказа грамадзянскім губернатарам» ад 3 ліпеня 1837 г. [5]. Мікалаеўскі наказ кваліфікаваў губернатараў як начальнікаў губерняў, якія павінны былі сачыць за выкананнем законаў, абавязваліся захоўваць грамадскі спакой, бяспеку, здаровы стан насельніцтва; забяспечваць харчаваннем губерню, аказваць бездапаможным апеку; ажыццяўляць нагляд за правасуддзем, выкананнем законных пастаноў і патрабаванняў [5, с. 362].

У сферу дзейнасці губернатараў уваходзілі абавязкі па выкананню і ахове законаў. Разам з тым іх паўнамоцтвы абмяжоўваліся. Яны не мелі права выдаваць новыя пастановы, зацвярджаць новыя падаткі, змяняць судовыя прысуды. Губернатары павінны былі клапаціцца пра апублікаванне законаў на падначаленых ім тэрыторыях. Яны абавязаны былі сачыць за справаводствам губернскага праўлення, правільным выкананнем спраў паліцэйскімі і судовымі ўстановамі, гарадскімі ўпраўленнямі [4, с. 63–65].

Начальнікі губерняў таксама апекавалі грашовыя сумы і казённую маёмасць падуладных ім устаноў, старшынствавалі ў губернскім праўленні, калі лічылі гэта патрэбным, прысутнічалі пры агульным сходзе палат – у выпадку старшынства галоўнага начальніка края (генерал-губернатара) [4, с. 66].

Губернатары адказвалі за тое, каб пасады ў падначаленых ім установах займалі добранадзейныя і здольныя чыноўнікі. Для гэтага яны павінны былі збіраць звесткі аб здольнасцях, адказных якасцях і ладзе жыцця апошніх. Гэтая інфармацыя ўлічвалася губернатарамі і пры назначэннях [4, с. 67].

Між тым начальнікі губерняў не мелі права ўмешвацца ў дваранскія выбары, хаця павінны былі дастаўляць губернскаму прадвадзіцелю спісы дваран, якія знаходзіліся пад судом ці следствам [4, с. 68]. Закон прадпісваў губернатарам накіроўваць для зацвярджэння ў грамадзянскім ведамстве спісы абраных на дваранскім сходзе кандыдатаў на павятовыя і губернскія пасады і адхіляць тых, хто не адпавядаў законным падставам [4, с. 68].

Таксама губернатары сачылі за прызначэннем на пасады канцылярскіх служачых у губернскае праўленне і іншыя ўстановы з тым, каб вакансіі займалі людзі здольныя да грамадзянскай службы і без судзімасцяў [4, с. 69].

Акрамя таго, на губернатара ўскладалася яшчэ адна вельмі важная задача – інфармаванне цэнтральнай улады. Ён павінен быў падаваць у С.-Пецярбург штогадовую справаздачу аб становішчы спраў у губерні,

прадстаўляць ведамасці пра нядоімкі, аб рэкрутах, павіннасцях і іншыя звесткі [6, с. 81–82].

У час падрыхтоўкі сялянскай рэформы 1861 г. губернатары павінны былі садзейнічаць захаванню грамадскага спакою, каб сяляне заставаліся ў падпарадкаванні памешчыкам і не парушалі парадак [1, с. 38]. На беларускіх землях сітуацыя была іншая.

У сувязі з распаўсюджваннем у беларускіх губернях антыўрадавых акцый пратэсту, звязаных з падзеямі ў Польшчы, з 1861 г. тут уводзіліся пасады часовых ваенных губернатараў. Паўстанне 1863–1864 гг. прымусіла ўлады захаваць гэтыя пасады да 1864 г. [3, с. 12, 201].

Асаблівасцю інстытута губернатараў у беларускіх губернях была наяўнасць паміж ім і Міністэрствам унутраных спраў прамежкавага органа ўлады – генерал-губернатара. 25 студзеня 1864 г. назва пасады «віленскі ваенны, ковенскі, гродзенскі і мінскі генерал-губернатар» была перайменавана ў «віленскі, ковенскі, гродзенскі і мінскі генерал-губернатар» [7, с. 173]. Акрамя таго, з пачаткам паўстання 1863–1864 гг. віленскаму генерал-губернатару падпарадкоўваліся яшчэ Віцебская і Магілёўская губерні. Таму яго пасада гучала наступным чынам: «віленскі, ковенскі гродзенскі і мінскі генерал-губернатар і галоўны начальнік Віцебскай і Магілёўскай губерняў» [3, с. 212; 8, арк. 1].

У далейшым, у сувязі са зняццем ваеннага становішча, падкантрольная віленскаму генерал-губернатару тэрыторыя скарацілася. Магілёўская губерня была выведзена са складу Віленскага генерал-губернатарства 27 чэрвеня 1869 г., Віцебская – 2 лістапада 1869 г. [9, с. 234], Мінская губерня – 25 снежня 1870 г. [10, с. 622–623]. З 1870 г. галоўны начальнік краю пачаў называцца «віленскі, ковенскі і гродзенскі генерал-губернатар».

Яшчэ адной асаблівасцю Віленскай, Гродненскай і Мінскай губерняў было тое, што губернатары прызначалі земскіх спраўнікаў і засядацеляў земскіх судоў (замест выбірання іх дваранствам) [11, с. 52].

Па ўмовах судовай рэформы 1864 г., якая прадугледжвала аддзяленне суда ад адміністрацыі, умяшанне губернатара ў судаводства было забаронена [1, с. 38]. Указам ад 10 лютага 1864 г. начальнікі губерняў не дапускаліся да разгляду прыгавораў крымінальных палат, якія падлягалі рэвізіі Сената [12, с. 104–105]. У беларускіх губернях судовыя статуты ўводзіліся са значным абмежаваннем і спазненнем. Увядзеннеміравых суддзяў у Беларусі прадугледжвалася пачаць з 1871 г. Спісы кандыдатаў на гэтыя пасады, складзеныя часовымі павятовымі камісіямі, паведамляліся губернатару. Ён абмяркоўваў спісы з прадвадзіцелямі дваранства, гарадскім галавою, губернскім пракурорам, старшынёй судовых палат і падаваў іх міністру юстыцыі, які і прызначаў міравых суддзяў [13, с. 48; 14, с. 913–914]. Такім чынам, хоць судаводства і было адмежавана ад улады губернатараў, але на беларускіх землях яны маглі ўплываць на кадравыя прызначэнні ў судовай сферы.

Далейшыя змены ў функцыянаванне інстытута губернатарства ўнесла земская рэформа. Згодна з Палажэннем аб губернскіх і павятовых земскіх установах (1864) [15], земскія ўправы распараджаліся аб скліканні і адкрыцці земскіх сходаў з дазволу губернатараў [15, с. 10]. Апошнія абавязваліся зацвярджаць спісы выбаршчыкаў будучых дэпутатаў у земскія сходы і выбраных старшыняў павятовых земскіх упраў [1, с. 38]. Такім чынам, земствы траплялі ў залежнасць ад губернатараў.

Палажэннем аб земствах прадугледжвалася ўвядзенне іх толькі ў 33 губернях Расіі. Сярод іх беларускіх губерняў не згадвалася [15, с. 1–2]. На думку расійскай даследчыцы Ц. Ц. Міхеевай на ўскраінныя губерні земская рэформа не распаўсюджвалася, таму што там «не было памешчыцкага землеўладання» [2, с. 102]. На самай справе, на беларускіх землях земствы не ўводзіліся па палітычных прычынах. Перш за ўсё, з-за польскага паходжання ці апалячанасці большасці мясцовых землеўладальнікаў [16].

Палажэнне «Аб прасторы і межах улады губернатараў», якое ўступіла ў дзеянне 22 ліпеня 1866 г., вызначала новыя межы іх паўнамоцтваў. Дакумент узмацняў функцыю губернатараў па наглядзе за ўсімі адміністрацыйнымі ўстановамі і службовымі асобамі ў губерні [17, с. 953–954]. Начальнікам губерняў надавалася права праводзіць у любы час агульныя і раптоўныя рэвізіі ва ўсіх установах. Губернатар мог забараніць прызначэнне альбо перасоўванне чыноўнікаў губернскай адміністрацыі, калі лічыў іх недобранадзейнымі (аб чым паведамляў у адпаведнае міністэрства) [17, с. 953]. Губернатарам дазвалялася спыняць сходы розных таварыстваў «у выпадку выяўлення ў іх чаго-небудзь супраць дзяржаўнага парадку і грамадскай бяспекі і маральнасці» [17, с. 954]. Выключэнне складала толькі кантрольная палата, якая падпарадкоўвалася Дзяржаўнаму кантралёру [18, с. 38].

Пры гэтым, як адзначаў дарэвалюцыйны даследчык І. М. Страхоўскі, для губернатарскіх праверак не былі складзены інструкцыі, а без іх губернатары не маглі рэвізаваць мясцовыя ўстановы розных міністэрстваў [19, с. 75]. Гэта ставіла пад сумнеў легітымнасць вынікаў праверак.

Тым не менш рэвізіі праводзіліся. Напрыклад, у 1868 г. мінскі губернатар Я. А. Касінаў рэвізаваў даручаную яму губерню і выявіў нездавальняючы стан павятовых судоў [20, арк. 151]. Праўда, гэта мог быць звычайны агляд губерні, які губернатар павінен быў праводзіць пасля ўступлення на пасаду [5, с. 428–429].

Істотным чынам мяняліся паўнамоцтвы губернатараў і пасля правядзення рэформы гарадскога самакіравання (1870). Згодна з гарадавым Палажэннем ад 16 чэрвеня 1870 г., губернатары павінны былі сачыць за выкананнем органамі гарадскога самакіравання законаў. Між тым гарадскія думы выходзілі з поўнага падпарадкавання губернатарам [1, с. 38]. Але губернатары захоўвалі вялікія рычагі кантролю, паколькі кіраўнікі губернскіх гарадоў зацвярджаліся на пасадзе міністрам унутраных спраў

па прадстаўленні начальніка губерні, а кіраўнікі павятовых гарадоў – самім губернатарам [1, с. 39].

Фактычна земская і гарадская рэформы пашыралі функцыю нагляда, але абмяжоўвалі непасрэднае ўмяшальніцтва губернатара ў дзейнасць гэтых устаноў [21, с. 252].

У беларускіх губернях гарадавое Палажэнне 1870 г. уводзілася на пяць гадоў пазней. Як слушна адзначае даследчык М. А. Юрачкін, гэта было звязана з «польскім пытаннем» і перавагай яўрэяў сярод насельніцтва гарадоў і мястэчках заходніх губерняў [22, с. 25]. Акрамя таго, у Беларусі не толькі кіраўнікі губернскіх гарадоў зацвярджаліся на пасадзе міністрам унутраных спраў, але і усіх іншых гарадоў, калі іх кандыдатура выклікала ў губернатара сумненне [23, с. 262–263].

Такім чынам, у 60–70-я гг. XIX ст. адбывалася пашырэнне ўлады губернатара, што знайшло адлюстраванне ў заканадаўстве гэтага перыяду. Але на практыцы не ўсе паўнамоцтвы рэалізоўваліся. Увогуле губернатар заставаўся галоўным прадстаўніком вярхоўнай улады на месцах і з ім вымушаны былі лічыцца як начальнікі іншых ведамстваў, так і органы мясцовага самакіравання. Але апошнія ў сувязі з абмежаванасцю рэформаў у беларускіх губернях не атрымалі належнага развіцця. Таму ў разглядаемы перыяд інстытут губернатарства на тэрыторыі Беларусі захаваў больш паўнамоцтваў, чым у іншых рэгіёнах Расіі. У сваю чаргу начальнікі ўсіх беларускіх губерняў да 1869–1870 гг. знаходзіліся ў залежным становішчы ад віленскага генерал-губернатара і толькі пасля 1870 г. атрымалі больш самастойнасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Кононов, В. А.* Институт губернаторства в дореволюционной России: взаимодействие губернской и центральной администраций, 1708–1917 гг. (На материалах Смоленской губернии): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. А. Кононов; Смолен. гос. пед. ун-т. – Смоленск, 2005. – 214 с.

2. *Михеева, Ц. Ц.* Эволюция института губернаторства в Российской империи (историко-правовой аспект): дис. … канд. юрид. наук: 12.00.01 / Ц.Ц. Михеева; ГОУВПО «Рос. ун-т дружбы народов». – М., 2006. – 190 с.

3. *Бригадин, П. И.* Минские губернаторы: история власти / П. И. Бригадин, А. М. Лукашевич. – Минск: ГИУСТ БГУ, 2009. – 351 с.

4. Свод законов Российской империи: изд. 1857 г.: [в 16 т.]. – СПб., 1857. – Т. 2, ч. 1: Общее губернское учреждение. – 1474 с.

5. Общий наказ гражданским губернаторам: именной указ Сенату, 3 июля 1837 г., № 10303 // Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1838. – Т. 12: Отд. 1. – С. 361–439.

6. *Минаков, А. С.* Губернаторский корпус и центральная власть: проблема взаимоотношений: (по материалам губерний Черноземного центра второй половины XIX – начала XX вв.) / А. С. Минаков. – Орел: Орлик, Александр Воробьев, 2011. – 487 с.

7. О переименовании генерал-губернаторов, носящих звание и военного губернатора, и о подчинении военных губернаторов местным генерал-губернаторам: сенатский указ, 25 февраля 1864 г., № 40635 // ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1867. – Т. 39: Отд. 1. – С. 173.

8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 295. – Оп. 1. – Д. 1900. Ведомости о недвижимых имуществах, конфискованных в городах и селениях Минской губ. 6 авг. 1868 г. – 5 июля 1870 г.

9. Об изъятии Витебской губернии из ведения главного управления Северо-Западным краем: именной указ Сенату, 2 ноября 1869 г., № 47608 // ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1873. – Т. 44: Отд. 1. – С. 234.

10. Об изъятии Минской губернии из ведения главного управления Северо-Западным краем: именной указ Сенату, 25 декабря 1870 г., № 49062 // ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1874. – Т. 45: Отд. 2. – С. 622–623.

11. *Матханова, Н. П.* Полномочия губернатора в середине XIX в. Региональная специфика / Н. П. Матханова // Региональные процессы в Сибири в контексте российской и мировой истории: [материалы Всероссийской научной конференции (Новосибирск, 3–4 марта 1998 г.) / редкол.: Л. М. Горюшкин (отв. ред.) [и др.]. – Новосибирск: Ин-т истории СО РАН, 1998. – С. 50–53.

12. Об изъятии начальников губерний от рассмотрения тех приговоров уголовных палат, кои, по силе самого закона, подлежат ревизии Правительствующего Сената: мнение Гос. совета, 10 февраля 1864 г., № 40584 // ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1867. – Т. 39: Отд. 1. – 104–105.

13. *Бригадин, Д. П.* Преступность в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в.: дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Д. П. Бригадин. – Минск, 2017. – 144 с.

14. Временные правила об устройстве мировых судебных установлений в губерниях: Виленской, Ковенской, Гродненской, Киевской, Волынской, Подольской, Минской, Витебской и Могилевской, впредь до введения земских учреждений: именной указ Сенату, 23 июня 1871 г., № 49750 // ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1874. – Т. 46: Отд. 1. – С. 913–916.

15. Положение о губернских и уездных земских учреждениях: именной указ Сенату, 1 января 1864 г., № 40457 // ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1867. – Т. 39: Отд. 1. – С. 1–14.

16. *Сорокина, В. В.* Политика русского самодержавия в отношении западных земств / В. В. Сорокина // Правоведение [Электронный ресурс]. – 1979. – № 1. – Режим доступа: http://www.law.edu.ru/article/article.asp?articleID=187030 – Дата доступа: 01.02.2018.

17. О пространстве и пределах власти губернаторов: высочайше утвержденное положение Комитета министров, 22 июля 1866 г., № 43501 // ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1868. – Т. 41: Отд. 1. – С. 953–954.

18. *Подорожняя, Е. А.* Местные органы государственной власти и управления в Беларуси (1861–1914 гг.): структура, функции, кадры: дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Е. А. Подорожняя. – Минск, 2014. – 180 с.

19. *Страховский, И. М.* Губернское устройство / И. М. Страховский // Журнал Мин-ва юстиции. – 1913. – № 7–8. – С. 31–92.

20. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1931. Сведения о результатах ревизии уездных присутственных мест и учреждений, произведенной начальником губернии. – 23 июня – 5 ноября 1868 г.

21. *Блинов, И. А.* Губернаторы. Историко-юридический очерк / И. А. Блинов. – СПб.: типо-лит. К. Л. Пентковского, 1905. – 365 с.

22. *Юрочкин, М. А.* Реформа городского самоуправления в Беларуси во второй половине XIX – начале XX вв. / М. А. Юрочкин. – Гомель: Белницэкология, 2002. – 151 с.

23. О применении Городового положения 1870 г. к городам Западных губерний: мнение Гос. совета, 29 апреля 1875 г., № 54640 // ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1868. – Т. 50: Отд. 1. – С. 462–464.

**(Дата падачы: 14.02.2018 г.)**